НАРОДНАЕ
АПЫТАННЕ

Чэрвень 2023

# БЕЛАРУСКАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ ЯК АСАБІСТЫ НАБЫТАК



*Ідэнтычнасць – гэта шматузроўневы і складаны феномен, які рэдка ўзгадваецца ў спакойным паўсядзённым жыцці. Але як жыццё ў Беларусі пасля 2020-га года складана назваць спакойным, так і пытанне беларускай ідэнтычнасці цяпер перажывае ці не самы актыўны этап свайго абмеркавання.*

*З гэтай нагоды Цэнтр новых ідэй сумесна з ініцыятывай “Народнае апытанне” правялі даследаванне асаблівасцяў таго, як прадстаўнікі дэмакратычнай часткі беларускага грамадства ўсведамляюць нацыянальную тоеснасць. Даследаванне праводзілася ў траўні-чэрвені 2023-га года шляхам інтэрнэт-апытання. У ім паўдзельнічалі 4000 чалавек, з якіх 2127 – гэта тыя, хто цяпер знаходзіцца ў Беларусі.*

## Мова даследавання

Даследаванне мела і эксперыментальны складнік – рэспандэнты маглі выбіраць, на беларускай ці расейскай мове адказваць на пытанні анкеты. У выніку беларускую мову выкарысталі 70% рэспандэнтаў (на графіках: “бел”), расейскую – 30% (на графіках: “рас”). У адказах удзельнікаў, якія знаходзяцца ў Беларусі, прапорцыя амаль тая ж: 67% і 33%.

Прыкладна такая ж прапорцыя ў выбары мовы захоўваецца практычна ва ўсіх вылучаных сегментах рэспандэнтаў. Пры гэтым ёсць цікавае і парадаксальнае выключэнне –старэйшыя ўзроставыя групы. Тэарэтычна можна было б чакаць, што сярод людзей ва ўзросце будзе больш носьбітаў беларускай мовы і яны больш актыўна будуць выбіраць яе пры апытанні. Аднак атрымалася наадварот: калі сярод людзей ва ўзросце да 50 гадоў беларускую мову выбіралі ў сярэднім 71-73% рэспандэнтаў, то ва ўзросце 51-60 гадоў – 65%, а людзі ў веку 61 год і старэйшыя – 55%.

Акрамя таго, сярод тых, хто не падтрымлівае пратэст (у апытанні ўзялі ўдзел і такія рэспандэнты, хоць іх было і няшмат), беларускую мову для запаўнення анкеты выбралі толькі 29% рэспандэнтаў.

## Ідэнтычнасць як набытак

Падчас апытання 89% рэспандэнтаў назвалі сябе беларусамі. У цэлым гэта супадае са звесткамі перапісу ў Беларусі 2019-га года, дзе беларускую нацыянальнасць як сваю пазначылі 85%. У той жа час толькі ў паловы рэспандэнтаў абодва бацькі маюць беларускае грамадзянства і краіну нараджэння – Беларусь. Калі зрабіць яшчэ адзін крок у глыб сямейнай гісторыі і паглядзець на нашых дзядоў, то доля людзей, чые продкі ў трэцім пакаленні былі беларусамі і нарадзіліся ў Беларусі, – складзе ўсяго 25%.

Праз гэта можна канстатаваць, што ў справе фармавання ідэнтычнасці сямейная гісторыя і сямейныя традыцыі пры ўсёй іх важнасці, хутчэй за ўсё, займаюць далёка не першыя месцы. Галоўным чыннікам у акрэсленні нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўляецца самасвядомасць і самавызначэнне асобы, што ёсць класічным правілам для мадэрнага еўрапейскага часу (цалкам згодна з тэорыямі сацыяльнага канструктывізму).

Тое, што менавіта самавызначэнне з’яўляецца галоўным чыннікам ідэнтычнасці, кажуць і самі рэспандэнты.

**Каго, як вы мяркуеце, можна лічыць беларусам / беларускай?**



Адзначым, што "нейтралы" і тыя, хто не падтрымлівае пратэст, сярод іншых чыннікаў ідэнтычнасці часцей за іншых звяртаюць увагу на грамадзянства, а людзі ва ўзросце большым за 40 гадоў (як і тыя, у каго няма вышэйшай адукацыі) часцей абіраюць прынцып "любіць Беларусь".

## Адчуванне і важнасць ідэнтычнасці

Тэзіс пра ідэнтычнасць як асабісты набытак падмацоўваецца наступнымі лічбамі: 77,6% апытаных маюць высокае адчуванне сваёй тоеснасці, для 76,2% яна важная (8 балаў і болей).

Тут звяртае на сябе ўвагу тое, што сярод тых, хто выбраў беларускую мову, абодва гэтыя паказнікі – і ўсведамленне нацыянальнасці, і яе важнасць – вышэйшыя, чымся ў тых, хто выбраў расейскую мову для запаўнення анкеты (па 83% супраць 65% і 61% адпаведна). Гэта адзін момант.

Другі момант. Высокую ступень усведамлення сваёй нацыянальнасці выказваюць не толькі прыхільнікі пратэсту, але і праціўнікі (у апытанне трапіла невялікая колькасць і такіх рэспандэнтаў). Гэта адпаведна 82% і 77%. І тут няма парадоксу. Гэта факт, які таксама вынікае са справаздачы па праекце "Беларуская нацыянальная ідэнтычнасць у 2022: досвед колькаснага даследавання": У Беларусі цяпер суіснуюць два палітычныя праекты ідэнтычнасці – "нацыянальна-дэмакратычны" і "нацыянальна-савецкі". І кожны з гэтых праектаў мае сваіх паслядоўнікаў, для якіх беларуская ідэнтычнасць ёсць важнай.

Адсюль вынікае трэці момант – палітызацыя нацыянальнай ідэнтычнасці. Можна заўважыць, што палітызацыя тым ці іншым чынам працінае адказы на шмат якія пытанні далей.

## Гістарычны складнік

Калі казаць пра своеасаблівую гістарычную "начынку", змест ці праявы ідэнтычнасці, то яны вызначаюцца наступным.

Практычна палова апытаных (48%) лічыць, што падмуркам ці пачаткам гісторыі беларускай дзяржаўнасці з'яўляюцца старажытныя Полацкае і Турава-Пінскае княствы, на другім месцы (і з гледзішча гісторыі, і паводле важнасці) – Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (29%). Але разам з гэтым час ВКЛ, перыяд існавання Вялікага Княства, – гэта тая эпоха, якая, паводле апытаных, найбольш паўплывала на развіццё беларускага народа. Такога меркавання прытрымліваецца 71% апытаных. Другое месца дзеляць паміж сабой эпоха федэратыўнай Рэчы Паспалітай і час Беларускай Народнай Рэспублікі – па 36%.

**Якія перыяды найбольш паўплывалі на развіццё беларускага народа?**



> *А ТОП-10 персон, якія зрабілі найбольш на карысць Беларусі і беларусаў, выглядаюць наступным чынам:*
>
> 1. **Кастусь Каліноўскі**
> 2. **Францыск Скарына**
> 3. **Князь Вітаўт**
> 4. **Леў Сапега (і цалкам род Сапег)**
> 5. **Тадэвуш Касцюшка**
> 6. **Род Радзівілаў цалкам**
> 7. **Янка Купала**
> 8. **Пётр Машэраў**
> 9. **Станіслаў Шушкевіч**
> 10. **Еўфрасіння Полацкая**

## Палітычная плашчыня

У палітычнай плашчыні маем наступнае. Па-першае, практычна ўсе апытаныя (95%) цалкам чакана выказваюцца за тое, што нам не трэба ніякіх саюзаў з Расеяй і стасункі з ёй мы мусім выбудоўваць гэтак жа, як і з іншымі краінамі.

Па-другое, такое стаўленне да Расеі не азначае, што адзіны магчымы варыянт геапалітычнага руху – на Захад, хоць гэта самы папулярны варыянт адказу на пытанне аб тым, якім мусіць быць галоўны кірунак знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі (59%).

### Якім мусіць быць асноўны кірунак знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі?




Сярод беларусаў дасюль папулярная ідэя, што Беларусі не трэба ні на каго арыентавацца, што ў нас мусіць быць самастойная палітыка, прынамсі так лічаць 35% апытаных. Прычым такая “нейтральная” пазіцыя мае большую падтрымку сярод расейскамоўных рэспандэнтаў, чымся сярод беларускамоўных.

Калі ж варыянты выбару зрабіць больш жорсткімі і запытацца пра два гіпатэтычныя рэферэндумы “ў найбліжэйшую нядзелю” аб уступленні ў Еўрасаюз і ў Расею, – то “за” (разам з “хутчэй за”) уваход у Еўрасаюз выказваецца пераважная большасць і беларуска-, і расейскамоўных рэспандэнтаў – агулам 89%.

Адпаведна, у выпадку рэферэндуму пра аб’яднанне з Расеяй больш за 90% галасавалі б супраць.

Трэці момант, хутчэй перспектыўны. Цяпер час ад часу ўзнікаюць дыскусіі адносна такой пасляваеннай перспектывы, як Балта-Чарнаморскі саюз. Вынікі даследавання кажуць, што для дэмакратычнай часткі беларускага грамадства гэтая ідэя можа быць больш прывабнай, чым уваход у ЕС.

### Стаўленне да Балта-Чарнаморскага саюзу




## І апошні блок даследавання – палітыка беларусізацыі

Атрыманыя звесткі паказваюць, што пераважная большасць дэмакратычнай часткі грамадства лічыць: палітыка беларусізацыі мусіць быць (“адназначна” ці “хутчэй мусіць”). Зразумела, што беларускамоўныя рэспандэнты больш актыўна выказваюцца на яе карысць.

### Ці патрэбная Беларусі палітыка беларусізацыі?




Адносна хуткасці, з якой трэба ажыццяўляць гэты напрамак палітыкі, таксама ёсць паразуменне, хоць і не такое відавочнае. Так дзесьці 2/3 апытаных лічаць, што ў розных галінах грамадства беларусізацыя мусіць ісці рознымі тэмпамі (што нагадвае адказы на пытанні аб пажаданых тэмпах рэформ у краіне). Аб тым, што яе трэба праводзіць максімальна хутка, кажуць 21% рэспандэнтаў. А за тое, каб не спяшацца ў гэтым пытанні, выказаліся 13%.

Па моўным пытанні ("якая мова павінна быць дзяржаўнай у Беларусі?") расклад атрымаўся такі:

- за тое, каб дзяржаўнай мовай была толькі беларуская, выказаліся 72% апытаных (у Беларусі – 67%);
- каб дзяржаўных моваў было дзве, беларуская і расейская, – 23% (28% у Беларусі);
- каб дзяржаўнай мовай была расейская – меней 1%.

Па іншых момантах палітыкі беларусізацыі карціна мае наступны выгляд: найбольшую колькасць выбараў атрымаў варыянт папулярызацыі беларушчыны праз разнастайныя імпрэзы, накшталт выставаў, канцэртаў, тэатральных пастановак і г.д. (54%). З ім спалучаецца такая пазіцыя, як "Стымуляванне цікавасці да беларускай гісторыі, міфалогіі, фальклору..." (пятае месца і 39%). Гэтак пераважаюць, хутчэй, памяркоўныя метады, накіраваныя на матывацыйную сферу грамадства.

На другім месцы знаходзіцца перавод усяго справаводства на беларускую мову (50%), што больш тычыцца чынавенства, чымся агулам грамадства. Трэцяе месца – перавод усёй школьнай адукацыі на беларускую мову (49%), што ўжо значна больш адчувальна для шараговага беларуса. Чацвёртае месца – перайменаванне вуліц у гарадах і вёсках у гонар беларускіх гістарычных дзеячаў (ці вяртанне вуліцам іх гістарычных назваў), за што выказаліся 47% апытаных.

Самы радыкальны варыянт з прапанаваных пазіцый – абмежаванні для расейскамоўных мерапрыемстваў – набраў усяго 5%. Нагадаем, што гэта меркаванні, выказаныя пратэснай часткай беларускага грамадства

### Па якіх напрамках у Беларусі мусіць ісці палітыка беларусізацыі?



**Як галоўную выснову даследавання высунем наступны тэзіс:**

*– у 2020-ым годзе сапраўды адбылося перакадаванне беларускай нацыянальнасці і перараджэнне беларускай нацыі. Замест напаўразбураных (доўгачасовая сямейная традыцыя) або дэфармаваных (адукацыйна-ідэалагічная сістэма) інструментаў фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці запрацавалі іншыя механізмы – не інстытуцыйныя, але пераважна індывідуальныя, і не этнічныя, а хутчэй грамадзянска-палітычныя.*

*Гэта значыць, шмат для каго беларушчына сёння – не традыцыя ці спадчына, а хутчэй адкрыццё і дасягненне, якія яшчэ патрабуюць дапаўнення, дапрацавання і сістэматызацыі.*

НАРОДНАЕ АПЫТАННЕ

Народнае апытанне — незалежны праект па вывучэнню грамадзкага меркавання ў Беларусі.

*[https://narodny-opros.net](https://narodny-opros.net)*

ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ

Цэнтр новых ідэй — аналітычны цэнтр, дзейнасць якога прысвечаная магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі. Наша місія ў тым, каб дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, заможную і ўстойлівую Беларусь.

*[https://www.newbelarus.vision](https://www.newbelarus.vision)*

Фота: Polskie Radio

Чэрвень 2023